6. Карский, Е. Ф. Белорусы / Е. Ф. Карский. – Минск : Беларус. Энцыкл., 2006. – Т. 1 : Введение в изучение языка и народной словесности. – 656 с.
7. Русские достопамятности, издаваемые обществом истории и древностей российских. – М. : Университет. тип., 1815. – Ч. 1. – 199 с.
8. Birgegård, U. Nicolaus Bergius: A Historico-Theological Exercice on the Status of the Muscovite Church and Religion / U. Birgegård, M. Hedlund. – Stockholm : Kungl. Vittershets Historie och Antikvitets Akad., 2019. – 327 p.

*УДК 811.161.3'373.211'23:159.937:316.74*

**Мезенка Г. М.**

*(Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П. М. Машэрава, г. Віцебск, Беларусь)*

## СУЧАСНЫ ЎНУТРЫПАСЕЛІШЧНЫ АНАМАСТЫКОН: СІГНАЛЫ ФАСЦЫНАЦЫІ Ў НАМІНАЦЫЙНАЙ ПРАКТЫЦЫ БЕЛАРУСАЎ

*The article is dedicated to the problem of studying the phenomenon of fascination and its role in intra-settlement nomination. The article clarifies the means of fascination that contribute to the acceptance of the message of the nominators of Belarusian streets, alleys, squares and other intra-settlement objects. The signs of fascinating signals possessed by urbanonymy, viconymy, hortensionymy – fascinating language – are determined, which is very important for interaction and mutual understanding in the nominative communication of former and modern inhabitants of the country's settlements. It is emphasized that this direction of research into the human nature and into the nature of society may be useful for those who are interested in the laws and secrets of not only biological and social, but also onomastic communication.*

***Keywords:*** *onomasticon, viconymy, symbolic information, communication, nominative practice, signal, fascination, hortensionymy, urbanonymy.*

У тэрміна «сігнал» (ад лац. *signum* 'знак') існуе немалая колькасць спроб сфармуляваць дастаткова зручнае яго вызначэнне. Так, у фізіцы гэта код (сімвал, знак), створаны і перададзены ў прастору (па канале сувязі) адной сістэмай, або ўзніклы ў працэсе ўзаемадзеяння некалькіх сістэм; у тэхніцы – матэрыяльнае ўвасабленне паведамлення для выкарыстання пры перадачы, перапрацоўцы і захоўванні інфармацыі; у тэорыі інфармацыі і сувязі – носьбіт інфармацыі, які выкарыстоўваецца для перадачы паведамленняў у сістэме сувязі [6]. Гэтае паняцце шырока выкарыстоўваецца таксама ў псіхафізіялогіі і нейрапсіхалогіі, у псіхафізіцы, інжынернай і агульнай псіхалогіі пры даследаванні перцэпцыйных працэсаў, у сацыялогіі пры вывучэнні працэсаў камунікацыі, дзе пад ім разумеюць працэс або з'яву, якая нясе паведамленне аб якой-небудзь падзеі і арыентуе жывую сістэму адносна гэтай падзеі. У залежнасці ад характару аналізатараў і іншых успрымальных сістэм вылучаюць акустычныя, аптычныя, біярытмічныя, тактыльныя, тэрмічныя, хімічныя, электрамагнітныя і іншыя сігналы.

Як шматлікія і разнастайныя сігналы і сігнальныя сістэмы, так шматлікія і розныя іх функцыі. Сучаснай навуцы вядомы разнастайныя функцыі сігналаў і знакаў – апелятыўная, канатыўная, экспрэсіўная, эматыўная і інш. У апошнія два дзесяцігоддзі, а дакладней з 2003 г., калі быў дадзены старт новай фундаментальнай навуцы – фасцыналогіі [7; 8] і новаму напрамку ў даследаваннях прыроды чалавека і грамадства, навукоўцы пачалі да іх далучаць яшчэ і фасцынацыйныя функцыі, назва якіх мае адносіны да паняцця *фасцынацыя* (ад лац. fascino 'зачароўваць, заварожваць'). Даючы вызначэнне фасцыналогіі, стваральнік яе У. М. Сакоўнін ахарактарызаваў як «навуку аб фасцынацыі, аб чароўнай, дамінантнай і жахлівай сігналізацыі і камунікацыі ў прыродзе і грамадстве: ад вірусаў і раслін да прыматаў і чалавека» [9, с. 4]. Такія фасцынацыйныя функцыі, як арганізуюча-кіраўнічая, функцыя мабілізацыі на актыўнае дзеянне, пры якой фасцынацыйны сігнал не проста хвалюе і ўзбуджае, але і мабілізуе аптымальнай выявай на дасягненне сфасцынаванай мэты, функцыя эмацыянальнага тонусу, што злучае людзей у тонусе радасці і яднання, праганяе нуду, уласцівыя і сістэме назваў унутрыпаселішчных аб'ектаў.

Карысны для філосафаў, псіхолагаў, этнолагаў, палітолагаў, педагогаў [1–5; 10, 12], гэты напрамак даследавання прыроды чалавека і грамадства можа быць запатрабаваны і тымі, хто цікавіцца законамі і таямніцамі не толькі біялагічнай і сацыяльнай, але і анамастычнай, у прыватнасці ўрбананімічнай, віканімічнай і хартэнсіанімічнай камунікацыі.

Мэтай гэтага даследавання з'яўляецца вызначэнне прыкметы і ролі сігналаў фасцынацыі ў практыцы намінацыі беларусамі вуліц і іншых унутрыпаселішчных аб'ектаў.

Крыніцай фактычнага матэрыялу для даследавання паслужылі даныя Нацыянальнага кадастравага агенцтва Рэспублікі Беларусь у выглядзе поўных спісаў назваў вуліц населеных пунктаў Беларусі.

Цяпер шмат якія актуальныя пытанні анамастыкі нельга вырашыць інакш, чым у рамках комплекснага навуковага падыходу. Сярод такіх істотных праблем, як намінацыя ўнутрыпаселішчых лінейных, планарных і кропкавых аб'ектаў, эфектыўнасць намінацыйнага працэсу, матывацыя назваў, важнай уяўляецца арганіцыя намінацыйнага працэсу з улікам сродкаў фасцынацыі.

Дарэчы, нягледзячы на тое, што фасцыналогія як асобная навука толькі пачынае афармляцца, існуюць розныя азначэнні фасцынацыі. Так, Ю. В. Кноразаў пад ёю разумеў сігнал, што не пакідае абыякавым, прабівае любыя фільтры і захоплівае мозг, нервовую і гарманальную сістэмы. Фасцынацыя спараджае імгненную рэакцыю [1]. На думку вучонага, спачатку знакі фасцынацыі выяўляліся ў выглядзе невербалікі. У. М. Сакоўнін вызначае фасцынацыю больш шырока – як «здольнасць знешняй формы, дэманстрацыйнага камунікатыўнага сігналу ці нават прыроднай з'явы (заход або ўзыход сонца, паўночнае ззянне, вычварныя формы скал і г. д.) прыкоўваць увагу, выклікаць падвышаную цікавасць, здзіўленне, радасць, захапленне, сімпатыю, зачараванне,

шок, спалох, экстаз, абыходзячы або адключаючы якое-небудзь логіка-вербальнае тлумачэнне, інтэлектуальнае аргументаванне і тым больш крытыку» [7, с. 9].

Намінацыю як акт прысваення імені аб'екту, у прыватнасці ўнутрыпаселішчнаму, можна аднесці да з'яў, якія прынята абазначаць тэрмінам «зносіны». Кожнае новае пакаленне жыхароў таго ці іншага населенага пункта, называючы вуліцу, завулак, праспект і інш., кіруецца сваімі мэтамі, інтэнцыямі, мае сваё ўяўленне аб гэтым характары зносін і можа аказаць уплыў на погляды, меркаванні іншых жыхароў паселішча, здольна паўплываць на ўспрыманне партнёраў па зносінах. Інфармацыя, адрасаваная гараджанам ці вяскоўцам, павінна дасягнуць іх свядомасці. Пры гэтым камунікацыя – гэта не толькі інфармацыя, а яшчэ і аптымізацыя перадачы паведамленняў. Фасцынацыя, якая звычайна дапаўняе інфармацыю, мае ўласцівасць блакіраваць бар'еры недаверу, што могуць узнікаць паміж рознымі пакаленнямі намінатараў і карыстальнікаў назваў унутрыпаселішчных аб'ектаў.

Паколькі фасцынацыя, якая, па сведчанні даследчыкаў, уздзейнічае на найстаражытнейшыя ўчасткі нашага мозга (так званы эмацыянальны мозг), спараджае імгненную рэакцыю, то знакі яе абапіраюцца на самыя моцныя эмоцыі, абяцаюць атрыманне задавальнення і асалоды або папярэджваюць аб небяспецы [гл. 6] і так шырока выкарыстоўваюцца ў жывой прыродзе ў выглядзе песні салаўя, у сутычцы самцоў, у яркай афарбоўцы жывёл і птушак [12, с. 30]. Менавіта таму фасцынацыяй «дыхае» і ўся дзейнасць чалавека, у тым ліку і намінацыйная.

Анамастыконы гарадоў, пасёлкаў і вёсак Беларусі пачатку XXI ст. уключаюць розныя праявы фасцынацыі, якія фіксуюцца ва ўрбанонімах, віконімах і хартэнсіонімах, што прадстаўляюць сваімі прапрыяльнымі часткамі тую інфармацыю, якая ўжо стала прадуктам фасцынацыйнай апрацоўкі. У дадзеным артыкуле прадстаўлены той набор прыкмет сігналаў фасцынацыі, якія зафіксаваны ў намінацыйнай практыцы беларусаў.

Фасцынацыйныя элементы разнастайна праяўляюцца ва ўнутрыпаселішчнай сістэме назваў унутрыгарадскіх і ўнутрысельскіх аб'ектаў як сродкаў намінацыйнай камунікацыі, якія хаваюцца найперш у незвычайных найменнях, выкарыстаных нячаста альбо нават аднаразова ў названых відах онімаў усёй краіны.

Усе ўнутрыгарадскія, унутрысельскія і ўнутрысадоўніцкія фасцынацыйныя сродкі маюць тую асаблівасць, што яны ўспрымаюцца чалавекам імгненна праз зрок або слых. Выкарыстанне незвычайнай для названай сістэмы назвы, як правіла, выклікае зваротную рэакцыю. Арганізацыя ўнутрыпаселішчнай сістэмы назваў аказвае пэўны ўплыў на думкі і погляды індывіда і калектыву.

Прымаючы пад увагу пакуль не вельмі багаты вопыт вучоных, якія займаюцца распрацоўкай праблем фасцынацыі (У. М. Сакоўнін, Ю. В. Кнаразаў, М. А. Стральцова, Н. Цінберген, В. А. Шыршоў і інш.), да прыкмет фасцы-

нацыйных сігналаў, што адлюстраваны ў беларускай урбананіміі, віканіміі і хартэнсіаніміі, можна аднесці:

1) *яркасць і маляўнічасць.*

Патрэбы эфектыўнай камунікацыі параджаюць такую прыкмету, якая, як лічыць Н. Цінберген, робіць усё, каб «сігнал стаў больш прыкметным і лягчэй распазнаваўся» [11, с. 11]. У жывой прыродзе многія кветкі, рыбы, птушкі дзівяць сваёй афарбоўкай і ўзорамі, не заўважыць якія вельмі цяжка, а то і немагчыма. Што да назваў унутрыпаселішчных аб'ектаў, то шмат урбанонімаў і віконімаў таксама маюць падобную маляўнічую экіпіроўку – ***Аксамітная вул.*** (г. Брэст), ***Бурштынавая вул.*** (г. Брэст, Кобрын, Магілёў), ***Ізумрудная вул.*** (г. Брэст, Магілёў), ***Крыштальная вул.*** (г. Брэст, г. п. Касцюкоўка Гомельскай вобл.), ***Малахітавая вул., Самшытавая вул.*** (г. Брэст), ***Жамчужная вул.*** (в. Калыбаўка Жлобінскага р-на Гомельская вобл.), ***Залатая вул., Залаты завул.*** (г. Мінск), ***Весялушная вул.*** (в. Скражына Празарокскага с/с Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл.), ***Ветлівая вул.*** (в. Лявонавічы Вілейскага р-на Мінскай вобл.), ***Гасцінная вул.*** (в. Шкірэлі Каменскага р-на Віцебскай вобл.), ***Дзівосная вул.*** (в. Гарадзец Лужкоўскага с/с Шаркаўшчынскага р-на Віцебскай вобл.), ***Добрая вул.*** (г. Брэст, в. Альшаны Столінскага р-на Брэсцкай вобл.), ***Добры завул.*** (г. Брэст, Кобрын), ***Запаветная вул.*** (г. Брэст), ***Казачная вул.*** (г. Брэст), ***Ладная вул.*** (в. Петрушэўшчына Валожынскага р-на Мінскай вобл.), ***Маляўнічая вул.*** (аг. Грычына Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), ***Надзейны завул.*** (в. Валасова Ноўкінскага с/с Віцебскага р-на Віцебскай вобл.), ***Перспектыўная вул.*** (г. Вілейка), ***Праменістая вул.*** (г. Гомель, Драгічын, Кобрын), ***Прывольная вул.*** (в. Мурава Бярэзінскага р-на Мінскай вобл.; в. Холма Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), ***Серабрысты завул., Сардэчная вул.*** (г. Брэст), ***Святочная вул.*** (г. Дзяржынск), ***Утульная вул.*** (г. Мінск, Кобрын), ***Уцешная вул.*** (г. Брэст), ***Уцешны завул.*** (г. Наваполацк), ***Хлебасольная вул.*** (в. Рагалі Камайскага с/с Пастаўскага р-на Віцебскай вобл.), ***Шчодрая вул.*** (г. Гродна) і пад. Дзякуючы таму, што надзелены такія фасцынацыйныя сігналы адмысловай яркай прыкметай, яны выключна эфектыўныя і таму часцей за ўсё дасягаюць мэты;

2) *тэатральнасць.*

Даволі часта фасцынацыя разгорнутая ў часе і прасторы. Такой прыкметай фасцынацыйнага сігналу адрозніваюцца, у прыватнасці ўрбанонімы ***вул. Зорны Шлях, Планетная вул.*** (г. Магілёў), ***Зямная вул.*** (п. Прыазёрны Вілейскага р-на Мінскай вобл.), ***Касмічная вул.*** (г. Жыткавічы, Асіповічы), ***Лунная вул.*** (в. Альшаны Столінскага р-на Брэсцкай вобл.; г. Магілёў; в. Серабранка Рагачоўскага р-на Гомельскай вобл.; п. Усход Магілёўскага р-на), ***Карагодная вул.*** (г. Гомель), ***Вячэрняя вул.*** (г. Давід-Гарадок; в. Альшаны Столінскага р-на Брэсцкай вобл.).

Сігнал такога кшталту набывае форму экспрэсіўнага ўспрымання навакольнага асяроддзя, падобнага да тэатра. У гэтым дапамагаюць пераканацца назіранні за рэакцыямі на падобныя назвы не толькі насельнікаў гэтых вуліц, але і гасцей паселішча, у якіх такая сігналізацыя абуджае цэлыя мастацкія кампазіцыі;

3) *усхваляванасць.*

Сігнал фасцынацыі, як ужо не раз адзначаў У. М. Сакоўнін, выклікае хваляванне. Ва ўцешна-чаруючай фасцынацыі – захопленае, а ў жахліва-шакіруючай – панічнае [8]. Аналіз анамастыконаў беларускіх гарадоў і вёсак паказаў: нягледзячы на тое, што дэманстрацыйныя сігналы застрашвання і навядзення жаху ў прыродзе і грамадстве не меней важныя з боку выжывання ў барацьбе за існаванне, у намінацыі аб'ектаў, размешчаных у вёсках і гарадах, галоўным абавязкам якіх гістарычна быў абавязак агарадзіць і пазбавіць насельнікаў ад уздзеяння злых сіл, пануюць фасцынацыйныя сігналы першай разнавіднасці – уцешна-чаруючай фасцынацыі. Так, уздзеяннем менавіта такога фасцынацыйнага сігналу можна патлумачыць хуткае фарміраванне захаплення, роздуму аб лепшых імгненнях жыцця пры знаёмстве з назвамі ***вул. Вернасці*** (в. Заблошчына Вілейскага р-на Мінскай вобл.), ***вул. Маладосці, вул. Радасці*** (г. Гомель), ***завул. Мары*** (г. Бяроза).

І толькі ў асобных назвах накшталт ***Мокры завул.*** (г. Лунінец; в. Лунін Лунінецкага р-на Брэсцкай вобл.), ***Халодная вул.*** (г. Гродна) можна ўгледзець прыкмету, набліжаную да ўсхваляванасці другога тыпу – жахліва-шакіруючай фасцынацыі: своеасаблівае папярэджанне магчымых нязручнасцей у сувязі з асаблівасцю глебы, па якой пракладзены завулак; ***вул. Выратавання*** (аг. Навасёлкі Барысаўскага р-на Мінскай вобл.), назва якой нібыта заклікае забыцца на папярэднія нягоды;

4) *уладарнасць.*

Можна меркаваць, што прыблізна такі фасцынацыйны сігнал, падобны на загад да дзеяння, утрымлівае віконім ***вул. Захват*** (в. Булыжыцы Магілёўскага р-на), прапрыяльная частка якога характарызуецца ўладарнай энергетыкай, мае адценне своеасаблівага навязвання. Гэту разнавіднасць прыкметы фасцынацыйнага сігналу рэпрэзентуюць і віконімы ***вул. Абуджэння*** (г. п. Круглае Магілёўскай вобл.), ***Авангардная вул.*** (г. п. Ушачы Віцебскай вобл.), ***Наша вул.*** (дачны пасёлак Лятохі Віцебскай вобл.), ***Незалежная вул.*** (аг. Негарэлае Дзяржынскага р-на Мінскай вобл.), якія сігналізуюць пра канататыўны арэол катэгарычнасці, безапеляцыйнасці, канчатковасці і ў пэўным сэнсе ўльтыматыўнасці;

5) *празмернасць.*

Асобныя сігналы адрозніваюцца празмернасцю, калі немагчыма іх не заўважыць. Напрыклад, такімі сігналамі характарызуюцца назвы лінейных унутрыпаселішчных аб'ектаў, што існуюць у загарадным пасёлку Навасады Барысаўскага р-на Мінскай вобл., які не мае статусу населенага пункта, – ***вул. 636 км, вул. в/ч 7404***, а таксама ў в. Вятчын Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл. – ***вул. 20-ы км***, і г. Ваўкавыск – ***Дамскі завул.***

Празмернасць і дапамае прыцягнуць увагу, не мінуць падобную назву, не застацца абыякавым да яе сэнсу. Дасягаецца яна дзякуючы выкарыстанню нязвыклых для прапрыяльнай часткі ўнутрыпаселішчных назваў сэнсавых і граматычных сродкаў;

6) *эксклюзіўнасць.*

Паколькі, надаючы імя ўнутрыпаселішчнаму аб'екту, сігналізуюць намінатары з іх індывідуальнымі інтарэсамі і матывацыямі, то, каб быць заўважанымі і выдзеленымі з шэрага іншых назваў, яны індывідуалізуюць сігналы, тым самым узмацняючы і падкрэсліваючы сваю індывідуальнасць. Гэта асабліва рэльефна праяўляе сябе, напрыклад, у магілёўскіх імядаўцаў, назаўшых адну з вуліц свайго горада незвычайным найменнем, якога няма ні ў адным з беларускіх паселішчаў, – ***вул. Вавёрчын кут***, а таксама ў намінатараў г. Вілейка, дзе існуе ўрбанонім ***вул. Добрай Волі***, г. Белаазёрск з назвай ***вул. Добрых Надзей***, г. Бяроза з урбанонімам ***вул. Вялікіх Надзей***. Такія ўрбанонімы адразу набываюць уласцівасць своеасаблівай персанальнай візітнай карткі горада. Калі паспрабаваць перакласці словамі гэты сігнал, то атрымаецца нешта накшталт «тут горад Магілёў», «тут горад Вілейка» ці «тут горад Белаазёрск», «а тут горад Бяроза». Дамагчыся эксклюзіву ў наш абцяжараны рознымі праблемамі час – адно з першых пажаданняў сучасных намінатараў лінейных і планарных аб'ектаў;

7) *імгненную канцэнтрацыю ўвагі.*

Пры ўздзеянні гэтага фасцынацыйнага сігналу адразу фарміруецца дамінанта ўвагі, аздобленая здзіўленнем і зацікаўленасцю.

Напрыклад, з такой рэакцыяй сустракаюцца жыхары і госці г. Магілёва, каму давялося чуць ці бачыць на шыльдзе назву ***Трохвугольны завулак***. Імгненная рэакцыя, узрушэнне, выкліканыя ўздзеяннем фасцынацыйнага сігналу, звязана з тым, што з самага пачатку свайго існавання апелятыў *завулак* заўжды звязваўся з лінейным аб'ектам: завулак – 'невялікая вуліца, якая звычайна злучае дзве іншыя вуліцы', а тут раптам трохвугольнік названы гэтым апелятывам.

Падобныя наступствы гэтага фасцынацыйнага сігналу адзначаюцца карыстальнікамі ўрбанонімаў ***вул. Мяцізнікаў*** г. Рэчыца, дзе намінатары папярэдняга гістарычнага перыяду ў якасці ўтваральнай асновы назвы вуліцы выкарысталі найменне раней існаваўшага, а цяпер мала каму вядомага расійскага футбольнага клуба з Магнітагорска *«Метизник»*, што на ўзроўні каманд майстроў гуляў у 1993–1997 гг. у другой і трэцяй лігах першынства Расіі; а таксама ***вул. МЮД***, што існуе ў гарадах Клімавічы і Слаўгарад, прапрыяльная частка якога – абрэвіятура геартоніма *Міжнародны юнацкі дзень* – свята моладзі, якое было ўстаноўлена Бернскай міжнароднай канферэнцыяй 1915 г. і праводзілася да 1945 г., а цяпер пра яго мала хто помніць.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што з усіх вылучаных фасцынолагамі прыкмет фасцынацыйных сігналаў найбольш пашыранымі ва ўрбананіміі, віканіміі і хартэнсіаніміі, якія выкарыстоўваюцца беларускімі намінатарамі, з'яўляюцца прыкметы першай разнавіднасці – уцешна-чаруючай фасцынацыі. Гэта тлумачыцца тым, што для намінацыі лінейных і планарных аб'ектаў адбіраюцца такія прыкметы фасцынацыйных сігналаў, якія здольныя падказаць, як палепшыць жыццёва важную прастору чалавека, і якія дапамагаюць

лягчэй арыентавацца ў ёй. Менавіта з дапамогай дадзеных прыкмет – яркасці і маляўнічасці, тэатральнасці, усхваляванасці, уладарнасці, празмернасці, эксклюзіўнасці, імгненнай канцэнтрацыі ўвагі – становіцца магчымым найбольш ярка і адэкватна выказаць свае мэты, інтэнцыі, сваё ўяўленне аб гэтым характары зносін.

Наш час, калі праблемы становяцца ўсё больш складанымі і ўзаемазлучанымі, патрабуе новага ўзроўню мыслення – міждысцыплінарнага. Прапанаванае даследаванне скіравана менавіта на такі падыход, што, на нашу думку, дапаможа аб'ядноўваць веды з розных галін, каб знайсці інавацыйныя і эфектыўныя рашэнні для складаных выклікаў.

З'яўленне новай навукі – фасцыналогіі – адкрывае яшчэ малавывучаныя перспектывы тэарэтычнага асэнсавання і практычнага выкарыстання сігналаў фасцынацыі ў сістэме ўнутрыпаселішчных назваў лінейных, планарных і кропкавых аб'ектаў як прыёмаў маніпулявання (у шырокім сэнсе гэтага слова) свядомасцю і паводзінамі жыхароў населеных пунктаў праз іх эмацыянальную сферу. Элементы фасцынацыі здольныя дапамагаць уздзейнічаць на намінацыйны працэс, а ў перспектыве – і на ўчынкі жыхароў населеных пунктаў. Фасцынацыя як феномен патрабуе далейшага навуковага вывучэння анаматолагамі.

Эфектыўнасць намінацыйнага працэсу наўпрост залежыць ад узроўню яго арганізацыі, у тым ліку і выкарыстання сродкаў фасцынацыі.

## *Спіс выкарыстаных крыніц*


1. Кнорозов, Ю. В. К вопросу о классификации сигнализации / Ю. В. Кнорозов // Основные проблемы африканистики : сб. ст. – М., 1973. – С. 324–334.

2. Крейдлин, Г. Е. Невербальная семиотика: Язык тела и естественный язык / Г. Е. Крейдлин. – М. : Новое лит. обозрение, 2002. – 592 с.

3. Крижанская, Ю. С. Грамматика общения / Ю. С. Крижанская, В. П. Третьяков. – Л. : Изд-во Ленинград. ун-та, 1990. – 208 с.

4. Поршнев, Б. В. Контрсуггестия и история (Элементарное социально-психологическое явление и его трансформация в развитии человечества) / Б. В. Поршнев // Историческая психология и социология истории. – 2010. – № 2. – С. 185–219.

5. Прокофьева, Л. П. Синестезия в современной научной парадигме / Л. П. Прокофьева // Известия Саратовского университета. Серия: Филология. Журналистика. – 2010. – Т. 10, вып. 1. – С. 3–10.

6. Собеседование по теории сигнализации с Ю. В. Кнорозовым // Структурно-типологические исследования : сб. ст. / отв. ред. Т. Н. Молошная. – М., 1962. – 298 с.

7. Соковнин, В. М. Фасцинология как наука / В. М. Соковнин // Фасцинология. – 2003. – № 1. – С. 9–14.

8. Соковнин, В. М. Фасцинология. Пролегомены к науке о чарующей, доминантной и устрашающей коммуникации животных и человека / В. М. Соковнин. – Екатеринбург : Изд-во Урал. ун-та, 2005. – 398 с.

9. Соковнин, В. М. Что такое фасцинация / В. М. Соковнин. – Екатеринбург : Автор. акад. фасцинологии, 2009. – 56 с.

10. Стрельцова, М. А. Фасцинация как метод преодоления коммуникативных барьеров / М. А. Стрельцова, Г. Г. Вербина // Образование и право. – 2019. – № 8. – С. 201–205.

11. Тинберген, Н. Социальное поведение животных / Н. Тинберген ; пер. с англ. Ю. Л. Амченкова ; под ред. П. В. Симонова. – М. : Мир, 1993. – 34 с.

12. Ширшов, В. А. Знаки фасцинации в педагогической коммуникации / В. А. Ширшов // Образование и наука. – 2004. – № 1 (25). – С. 29–37.

*УДК 659.4:81'42*

**Іўчанкаў В. І.**

*(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск, Беларусь)*

# БЕЛАРУСКІЯ СМІ Ў СІТУАЦЫІ ДЗЯРЖАЎНАГА БІЛІНГВІЗМУ: СУЧАСНЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ РАЗВІЦЦЯ МЕДЫЯМАЎЛЕННЯ

*Рассматриваются вопросы создания медиатекста в условиях государственного билингвизма, определяются новые тенденции в языке и стиле средств массовой информации. Исследуются проблемы интерферентного влияния на создание публицистического текста, что квалифицируется как отклонение от нормы и системы одного языка под воздействием другого – близкородственного. Определяется специфика медиаречи во время внедрения в журналистскую практику информационных технологий, результатом чего можно считать создание рискогенных зон интернет-коммуникации. Подчеркивается тенденция к нарастанию включенности носителей языка в консолидируемое массовым информационным продуктом национальное лингвокультурное пространство.*

***Ключевые слова:*** *медиаречь, билингвизм, публицистический текст, норма, лингвоэкология.*

Ва ўмовах функцыянавання дзвюх блізкароднасных моў маецца відавочная небяспека ўзаемапранікненняў у маўленчай і, у меншай ступені, моўнай сістэмах. Інтэрферэнцыя ў сітуацыі білінгвізму – справа непазбежная, аднак праяўленне яе зніжае маўленчую культуру. Укаранёны ў даследчую практыку функцыянальны аспект разгляду моўных фактаў зрабіў магчымым выявіць «паводзіны» жывога слова і адмежаваць у яго выкарыстанні ненарматыўнае, памылковае. Нарматыўнасць мовы заўсёды была паказчыкам яе развіцця, духоўнай культуры нацыі.

Норма фарміруецца ў выніку сацыяльна-гістарычнага адбору з суіснуючых слоў і форм, якія зафіксаваны ў моўнай плыні, больш распаўсюджаных, агульнапрынятых. Яны і павінны мацаваць фундамент нацыянальнай літаратурнай мовы. Вядома, што норме характэрна сістэмнасць і глыбокая сувязь са структурай мовы. Мова ж – з'ява дынамічная, і гэта не можа не адбіцца на стабільнасці, гістарычнай абумоўленасці нормы. Вонкавыя фактары (экстралінгвістычны ўплыў) і чыста моўныя заканамернасці, тэндэнцыі развіцця фанетычнай, лексічнай, граматычнай сістэм вызначаюць змены ў літаратурнай норме. Канец XX ст. быў пазначаны спецыфічнымі зменамі яе ў бок так зва-